Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНА-ПЕСЕННАЯ ТВОРЧАСЦЬ

*Тыпавая вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі
па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)*

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*У. К. Зяневіч*, прафесар кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;

*Л. К. Захлеўны,* мастацкі кіраўнік ансамбля народнай музыкі «Бяседа», народны артыст РБ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 23.11.2011 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.11.2011 г.);

навукова-метадычным саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 12.12.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *У. К. Зяневіч*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Беларуская народна-песенная творчасць» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-16 01 10 «Спевы (па напрамках)», напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 «Спевы (народныя)».

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская народна-песенная творчасць» з'яўляецца адной з асноўных дысцыплін прафесійнай падрыхтоўкі ў галіне сольнага народнага выканальніцтва. Яна займае цэнтральнае месца ў сістэме спецыяльных дысцыплін, якія маюць непасрэднае дачыненне да работы з народным песенным матэрыялам, забяспечвае для іх неабходную эмпірычную і тэарэтычную базу. З дысцыпліны «Беларуская народна-песенная творчасць» фактычна пачынаецца студэнцкая навукова-даследчая работа па аналізе, сістэматызацыі і даследаванні фальклорнага матэрыялу.

Фарміраванне асобы спевака-саліста, інтэрпрэтатара і транслятара нацыянальнага песеннага фальклору адбываецца ў працэсе непасрэднага далучэння да народнай песеннай творчасці праз засваенне цэлага комплексу сацыяльна-гуманітарных, агульных музычна-тэарэтычных, спецыяльных дысцыплін («Філасофія», «Культуралогія», «Эстэтыка», «Аранжыроўка беларускіх народных песень»), з якімі дысцыпліна «Беларуская народна-песенная творчасць» павінна быць узгоднена па змесце.

Эфектыўнасць выкладання дысцыпліны «Беларуская народна-песенная творчасць» забяспечваецца шляхам утварэння міжпрадметных сувязей «Беларускай народна-песеннай творчасці» з іншымі дысцыплінамі цыкла агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін («Сальфеджыа і тэорыя музыкі (гармонія, поліфанія, аналіз музычных формаў)», «Расшыфроўка беларускіх народных песень»)), якія ўтвараюць метадалагічную аснову творчай дзейнасці, забяспечваюць музычна-тэарэтычны падмурак, даюць магчымасць апрацоўкі эмпірычных фальклорных матэрыялаў і апрабацыі вынікаў працы на практыцы, фарміруюць светапогляд выканаўцы, што забяспечвае неабходны ўзровень падрыхтоўкі выпускніка ў вобласці традыцыйнай народнай музычнай культуры, дазваляе яму авалодаць сучаснымі метадамі даследавання і інтэрпрэтацыі народнай песні.

Асноўная *мэта* дысцыпліны «Беларуская народна-песенная творчасць» – фарміраванне сістэмы ведаў і навыкаў у галіне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай традыцыйнай музычнай культуры. Курс заклікаты даць студэнтам сукупнасць базавых ведаў пра асноўныя навуковыя катэгорыі і паняцці, пра месца народнай песні ў сістэме народнай культуры, пра спецыфічныя асаблівасці і заканамернасці гістарычнага развіцця музыкі вуснай традыцыі, пра жанравы склад беларускага песеннага фальклору ў яго рэгіянальнай разнастайнасці, пра прынцыпы і метады тэксталагічнага вывучэння песеннага фальклору і на гэтай аснове спрыяць падрыхтоўцы высокапрафесійнага музыканта-фалькларыста, выканаўцы народнай песні.

Дасягненне пастаўленай мэты вызначае *задачы* дысцыпліны:

– выяўленне спецыфікі народна-песеннай творчасці як інтэграванай часткі музычнага фальклору ў кантэксце традыцыйнай народнай культуры беларусаў;

– выпрацоўка сістэмы ўяўленняў аб беларускім песенным фальклоры як спецыфічнай сферы мастацкай дзейнасці народа са сваёй непаўторнай сістэмай эстэтычных каштоўнасцей;

– фарміраванне ўяўленняў і паняццяў пра натуральна-гістарычную, аб’ектыўную прыроду, сацыякультурную значнасць шматстайных формаў народнай традыцыйнай мастацкай культуры як асновы прадуктыўнага развіцця ўсёй сістэмы сучаснай духоўнай культуры, у тым ліку і разнастайных формаў прафесійнага мастацтва;

– паслядоўнае азнаямленне з комплексам навуковых паняццяў, якія набываюць у фалькларыстыцы і этнамузыкалогіі ўласнае значэнне (тэкст, мова, мастацкая форма, тэма, сюжэт, матыў, тып, варыянт, стыль, традыцыя, народная культура, мастацтва і інш.);

– засваенне выпрацаваных у айчыннай і замежнай тэорыі і практыцы метадаў даследавання народнай музыкі;

– засваенне знакавай лексікі, спецыяльных тэрмінаў і абазначэнняў як з арсеналу саміх выканаўцаў – захавальнікаў традыцыі, так і з навуковага апарату этнамузыкалогіі;

– набыццё ўменне выкарыстоўваць на практыцы атрыманыя веды і навыкі як для этнамузыкалагічнай працы (навуковая, навукова-метадычная і навукова-практычная дзейнасць па збіранні музычнага фальклору), так і для практычнай мастацкай творчасці (сольнае выканальніцтва);

– авалоданне асновамі комплекснага аналізу музычнага і паэтычнага тэкстаў народных песень;

– авалоданне трывалымі ведамі ў галіне беларускай народнай песеннай творчасці ва ўсёй разнастайнасці яе відаў і жанраў, выканаўчых песенных стыляў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– узбагачэнне слыхавой практыкі шляхам актыўнага засваення рытмічнага, інтанацыйна-меладычнага і ладавага комплексаў беларускага песеннага фальклору розных жанраў і рэгіянальных песенных стыляў;

– авалоданне творчымі навыкамі выканання ўзораў беларускага музычнага фальклору;

– выпрацоўка адпаведных навыкаў у галіне практычнай фалькларыстыкі (арганізацыя і правядзенне фальклорных экспедыцый, арганізацыя этнаграфічных фальклорных канцэртаў, запіс і выданне навуковых відэафільмаў, аўдыястужак і інш.);

– раскрыццё асноўных праблем сучаснай фалькларыстыкі і этнамузыказнаўства, засваенне бібліяграфіі па ўсёй праблематыцы курса.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– рэальнае гучанне беларускай народнай песні і традыцыйнай народнай музыкі;

– спецыфіку песеннага фальклору як важнай часткі традыцыйнай народнай культуры, спецыфічнай сферы мастацкай дзейнасці, асобай эстэтычнай сістэмы;

– ролю і месца песеннага фальклору ў сістэме сучаснай духоўнай культуры;

– асаблівасці, прызначэнне і функцыі музычна-паэтычнага фальклору, прынцыпы гістарычнага развіцця народнай традыцыйнай культуры;

– заканамернасці народнай песеннай творчасці;

– інтанацыйна-меладычныя, ладавыя, метрарытмічныя і структурныя асаблівасці народнай песні;

– сродкі мастацкай выразнасці песеннага фальклору;

– спецыфічныя прыёмы выканальніцтва;

– жанры беларускага песеннага фальклору;

– рэгіянальныя асаблівасці песенных стыляў Беларусі, іх праявы;

– гістарычныя этапы станаўлення і развіцця беларускай этнамузыкалогіі;

– спецыяльную літаратуру, асноўныя тэарэтычныя працы і публікацыі музычна-этнаграфічных матэрыялаў.

Студэнт павінен *умець:*

– карыстацца сучаснымі навуковымі метадамі аналізу разнастайных форм музычнага фальклору;

– выяўляць жанравыя прыкметы і класіфікаваць з’явы фальклору;

– абгрунтавана вызначаць жанравую прыналежнасць фальклорных тэкстаў, форму, стылявыя характарыстыкі народных песень;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– характарызаваць структуру фальклорна-этнаграфічнага тэксту, здзяйсняць аналіз моўных сродкаў і спосабаў выразу;

– выяўляць сувязі мастацкай формы з асноўнымі сэнсавымі і канструктыўнымі элементамі этнаграфічнага кантэксту (рытуальна-абрадавыя сітуацыі, акалічнасці актуалізацыі жыццёва значных намераў);

– характарызаваць сродкі выразнасці – мову фальклору ў адпаведнасці з жыццёвым прызначэннем, функцыяй: суадносіны слова з музычнай, харэаграфічнай, гульнявой, абрадавай і іншымі бакамі мастацкай сістэмы фальклору;

– выконваць узоры песеннага фальклору ў адпаведнасці з жанравай і рэгіянальнай стылістыкай і народнымі спеўнымі манерамі;

– валодаць метадамі сцэнічнага ўвасаблення фальклору;

– граматна карыстацца інфармацыйнымі крыніцамі для атрымання неабходнай прафесійнай інфармацыі;

– раскрываць змест асноўных навуковых катэгорый і растлумачваць паняцці, якія ўжываюцца ў музычнай фалькларыстыцы і этнамузыкалогіі.

У працэсе вывучэння дысцыпліны выкарыстоўваюцца сучасныя метады і інавацыйныя тэхналогіі навучання, такія як дыяхранічны і сінхранічны метады, метады структурнага мадэлявання, слыхавога і параўнальнага аналізу, структурна-тыпалагічны метад, этналінгвістычныя метады. Выкарыстоўваюцца лічбавыя тэхналогіі і найноўшыя тэхнічныя сродкі распазнавання гуку, разнастайнае сучаснае праграмнае забеспячэнне музычнай апрацоўкі і арганізацыі нотнага тэксту (камп’ютар і іншыя высокатэхналагічныя сродкі канвертацыі інфармацыі), якія дазваляюць аптымізаваць працэсы алічбоўкі аналагавых узораў, рэпрадуцыравання і шматразовага прайгравання, стварэння гукавых прэзентацый, адфільтраваць зафіксаваны матэрыял ад дэфектаў запісу, рэстаўрыраваць пашкоджаныя фрагменты запісу, забяспечваюць прынцыпова новы ўзровень нагляднасці ў выкладанні і камунікацыі ў навучанні.

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з палажэннем аб самастойнай рабоце студэнтаў, зацверджаным ва ўстанове вышэйшай адукацыі.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Беларуская народна-песенная творчасць» усяго адведзена 164 гадзіны, з якіх 78 – аўдыторныя заняткі (66 г. – лекцыі, 12 г. – семінарскія заняткі). Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 1 | |
| **Раздзел І. Фальклор у сістэме сучаснай духоўнай культуры** | | |
| ***Тэма 1.*** Фальклор як цэласная сістэма | 4 | 2 |
| ***Тэма 2.*** Жанравая класіфікацыя беларускага песеннага фальклору | 2 | |
| ***Тэма 3.*** Беларуская этнамузыкалогія: этапы станаўлення і развіцця | 1 | |
| **Раздзел ІІ. Марфалогія песеннага фальклору. Сродкі выразнасці беларускай народнай песні** | | |
| ***Тэма 4.*** Формы народнага вершаскладання | 2 | |
| ***Тэма 5.*** Страфічная арганізацыя беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 6.*** Музычна-рытмічная арганізацыя беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 7.*** Ладавая пабудова беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 8.*** Мелаінтанацыйныя асаблівасці беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 9.*** Фактура беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 10.*** Жанрава-стылявыя асаблівасці беларускай народнай песні | 2 | |
| ***Тэма 11.*** Выканальніцкія манеры спеваў беларусаў | 2 | |
| ***Тэма 12.*** Паэтыка беларускага песеннага фальклору | 2 | |
| **Раздзел ІІІ. Раннетрадыцыйны (архаічны) фальклор** | | |
| ***Тэма 13.*** Каляндарна-песенная культура Беларусі | 8 | |
| ***Тэма 14.*** Сямейна-абрадавы песенны цыкл | 6 | |
| ***Тэма 15.*** Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах іх выканання | 2 | |
| ***Тэма 16.*** Карагодна-гульнявая традыцыя беларусаў | 2 | |
| **Раздзел IV. Пазаабрадавая сялянская лірыка (класічны фальклор)** | | |
| ***Тэма 17.*** Стылістычныя рысы і асаблівасці пазаабрадавага песеннага фальклору | 2 | |
| ***Тэма 18.*** Жанравая сістэма пазаабрадавай лірычнай песні | 6 | |
| **Раздзел V. Нетрадыцыйны фальклор** | | |
| ***Тэма 19.*** Кантавая культура Беларусі | 2 | |
| ***Тэма 20.*** Прыпеўкі як від народнай песенна-музычнай мініяцюры | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел VI. Рэгіянальныя жанравыя і выканальніцка-стылістычныя асаблівасці беларускага песеннага фальклору** | | |
| ***Тэма 21.*** Традыцыйная мастацкая культура і песенныя традыцыі Беларускага Палесся | 2 | 2 |
| ***Тэма 22.*** Традыцыйная мастацкая культура і песенныя традыцыі Беларускага Паазер'я | 2 | 2 |
| ***Тэма 23.*** Традыцыйная мастацкая культура і песенныя традыцыі Беларускага Падняпроўя | 2 | 2 |
| ***Тэма 24.*** Традыцыйная мастацкая культура і песенныя традыцыі Беларускага Панямоння | 2 | 2 |
| ***Тэма 25.*** Традыцыйная мастацкая культура і песенныя традыцыі Цэнтральнага рэгіёна Беларусі | 2 | 2 |
| **Усяго …** | **66** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Дысцыпліна «Беларуская народна-песенная творчасць» у сістэме падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста ва ўстановах адукацыі культуры і мастацтваў. Месца дысцыпліны «Беларуская народна-песенная творчасць» у вучэбным, навукова-даследчым і мастацка-творчым комплексе адукацыйнай дзейнасці. Сувязь «Беларускай народна-песеннай творчасці» з комплексам сацыяльна-гуманітарных, агульных музычна-тэарэтычных, спецыяльных дысцыплін. Роля і значэнне дысцыпліны ў прафесійным станаўленні спецыяліста ў галіне культуры і мастацтваў.

## Раздзел I. Фальклор у сістэме сучаснай духоўнай культуры

### *Тэма 1. Фальклор як цэласная сістэма*

Паняцці культуры, духоўнай культуры, мастацкай культуры. Тыпы культур. Традыцыйная культура і музычны фальклор. Фальклор і мова як цэнтралізуючыя элементы ў сістэме нацыянальнай мастацкай культуры. Фальклор і праблемы экалогіі культуры. Фальклор як спецыфічная сфера мастацкай дзейнасці. Спецыфічныя рысы і характэрныя асаблівасці музычнага фальклору: вусная прырода існавання фальклору; біфункцыянальнасць; варыянтнасць і варыятыўнасць як формы існавання фальклорнага твора; імправізацыйны характар выканання; адзінства індывідуальнага і калектыўнага ў фальклоры; фальклорны сінкрэтызм. Народная песня як крыніца нацыянальнай музычнай лексікі. Фальклор і фальклярызмы. Эстэтычная сістэма беларускага песеннага фальклору. Сінкрэтычнае адзінства эстэтычных, маральна-этычных і ўтылітарна-практычных уяўленняў у беларускім фальклоры. Паняцце ўніверсальнага «дабра». Народныя ўяўленні пра прыгожае і агіднае, узвышанае і нізкае, трагічнае і камічнае. Эстэтычныя сімвалы ў беларускім песенным фальклоры.

### *Тэма 2. Жанравая класіфікацыя беларускага песеннага фальклору*

Паняцці родаў, відаў і жанраў народнага мастацтва. Структура беларускага песеннага фальклору (класіфікацыя па відах і жанрах). Гісторыка-стылявыя групы беларускага песеннага

фальклору. Шматфункцыянальнасць фальклору. Суадносіны ўтылітарна-прыкладной і эстэтычнай функцый. Функцыянальнае прызначэнне як вызначальны крытэрый у разуменні народных песенных жанраў. Дзве асноўныя групы песенных жанраў: песні прымеркаваныя і песні непрымеркаваныя. Формы прымеркаванасці песеннага фальклору: абрадавая, да відаў дзейнасці, сезонная. Жанры строга прымеркаваных песень. Жанры ўмоўна прымеркаваных песень. Жанры непрымеркаваных песень.

### *Тэма 3. Беларуская этнамузыкалогія: этапы станаўлення і развіцця*

Перадумовы этнамузыкалагічнай думкі ў Беларусі. Музычная фальклардыстыка ў канцы XIX – пачатку XX ст. Беларускі музычны фальклор у даследаваннях польскіх і чэшскіх вучоных. Кірункі развіцця беларускай этнамузыкалогіі ў савецкі перыяд. Музычная фальклардыстыка 1920-х гг. Беларуская этнамузыкалогія і пецярбургская школа Б. Асаф'ева. Практычная фальклардыстыка ў дзейнасці Р. Р. Шырмы і Г. І. Цітовіча. Росквіт беларускага этнамузыказнаўства: асноўная праблематыка даследаванняў 1960–1990-х гг. Беларуская этнамузыкалогія ў XXI стагоддзі.

## Раздзел II. Марфалогія песеннага фальклору. Сродкі выразнасці беларускай народнай песні

### *Тэма 4. Формы народнага вершаскладання*

Тыпы і формы вершаскладання. Тыпы верша ў фальклоры і ў тэорыі літаратуры. Меладычная, квантытатыўная, кваліта-тыўная формы вершаскладання. Стапа.

Тры тыпы народнага вершаскладання. Сілабічны або цэзурны верш. Складовая група. Падсумаванне складовай групы. Семантыка складовай групы. Цэзура і яе пазначэнне ў паэтычным тэксце. Роўнаскладовы верш і верш markedly рознага складовага аб'ёму. Часавік.

Танічны або акцэнтны верш. Рытмічная адзінка (сегмент) у танічным вершы. Структура танічнага верша (пачатковы сегмент, сярэдзінны сегмент, заключны сегмент). Віды акцэнтнага (танічнага) народнага верша: двухударны з дактылічнай фор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мулай заканчэння; двухударны з харэічнай формулай заканчэння.

Сілаба-танічны (стопны) народны верш і яго ўвасабленне. Наяўнасць стапы, рыфмаванасці і цэзуры як прыкмета народнага сілаба-танічнага верша.

### *Тэма 5. Страфічная арганізацыя беларускай народнай песні*

Тэрміны «паэтычная страфа» і «меладычная страфа». Песенная страфа і яе склад (форма або кампазіцыя страфы). Малыя рытмічныя адзінкі (складовая група (V) і сегмент). Музычна-паэтычны радок (рытмічны перыяд) і яго пазначэнне. Формула складовага рытму. Кампазіцыйныя адзінкі (КА). Складовая група (a, b, c і г.д.), радок (A, B, C). Формы паэтычных тэкстаў: фразавая, радковая і страфічная. Формы песеннай страфы. Страфічныя формы з унутрыстрофным паўторам. Рамачная кампазіцыя страфы. Песенна-страфічныя формы з рэфрэнам (r.; R). Велічыня рэфрэна (просты, складовы, падвойны). Від рэфрэна ў залежнасці ад месцазнаходжання (пачатковы, канцавы, унутранай пабудовы, рэфрэн, які атачае). Суадносіны: паэтычная страфа і меластрафа. Музычная страфа і куплет. Куплетная і куплетна-варыяцыйная формы. Формула верша. Формула напеву. Суадносіны формулы верша з формулай напеву.

### *Тэма 6. Музычна-рытмічная арганізацыя беларускай народнай песні*

Музычна-часавае мысленне народнага выканаўцы. Кароткія і доўгія працягласці. Двайковая і трайковая сістэмы злічэння. Музычна-складовы рытм як унутраная адзінка вымярэння часу песні ў фальклоры. Складовы час. Складовая музычна-рытмічная формула і яе вызначэнне. Формулы складовага рытму. Суадносіны рытмічнай структуры напеву і рытмікі паэтычнага тэксту. Рытмічная структура напеваў песень ранняга гісторыка-стылявога пласта (каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя песні). Рытмічная арганізацыя пазаабрадавых лірычных песень позняй традыцыі. Асноўныя рытмічныя фігурацыі. Пераважныя рытмічныя структуры. Унутрыскладовы распеў. Метр і памер песні. Музычная форма песні. Тактавая структура. Тактаванне цэзурных і сегментаваных напеваў. Часавікі. Драбненне. Падсумаванне. Адсутнасць музычнага часу паміж строфамі народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 7. Ладавая пабудова беларускай народнай песні*

Паняцце ладу як іманентнай (унутрана ўласцівай) структуры музычна-паэтычнага тэксту народнай песні. Лад як катэгорыя музычнага мыслення ў фальклоры. Нетэмпераванасць традыцыйнага музычнага слыху. Флуктуацыя гукавога ладу народнай песні. Гукарадная мабільнасць. Паняцце гукарада ў народнай музыцы. Лад і гукавы аб'ём, або амбітус шкалы народнай песні. Варыянтнасць гукарада ў народнай песні. Ладавая кампазіцыя, ці сістэма ладавых апор. Архаічны нетэмпераваны тып музычнага мыслення. Ангемітонныя гукарады: трыхорд у кварце (трытонікі), тэтрахорд у квінце (тэтратонікі), пентатоніка, гексахорд. Канцавы тон і праблема выяўлення ладу народнай песні. Танальна-гарманічнае мысленне ў песнях позняга фарміравання. Дыятоніка.

### *Тэма 8. Мелаінтанацыйныя асаблівасці беларускай народнай песні*

Мелодыя і інтанацыя. Вызначэнне мелодыі. Структурнае чляненне мелодыі. Жанравыя прыкметы мелодыі ў народнай песні. Інтанацыя. Вызначэнні інтанацыі. Інтанацыя як працэс і як гукавое ўвасабленне эмацыянальнага стану і мастацкага зместу музыкі. Разуменне своеасаблівасці музычнай інтанацыі ў народнай песні і незвядзенне яе да нотнага запісу. Тып інтанавання і стыль інтанавання. Інтанаванне як манера гуказдабывання. Інтанаванне як формаўтваральны і стылеўтваральны фактар. Заканамернасці непесенных і песенных формаў інтанавання; інтанацыі-загуканні, інтанацыі-галашэнні, спеўны і меладэкламацыйны (апавядальны) тыпы інтанавання. Тэмбравaтэсітурныя асаблівасці як важны фактар, які характарызуе працэс інтанавання. Мелаінтанацыйныя асаблівасці беларускай народнай песні. Асаблівасці гукавядзення. Характэрныя папеўкі ў беларускім песенным фальклоры. Напевы абагуленыя (тыпавыя) і індывідуалізаваныя. Формульнасць як найвышэйшая праява абагульнення змястоўнага і знакава-выразнага бакоў той ці іншай з'явы фальклору. Паэтычныя формулы, рытмаформулы, напевы-формулы, знакі-знакі харэаграфічнага арнаменту і інш. Значэнне формульнасці ў розных жанрах музычнага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Фактура беларускай народнай песні*

Паняцце фактуры народнай песні як сукупнасці прыёмаў падачы музычнага матэрыялу, пабудовы музычнай тканіны. Драматургія народнай песні і музычная фактура як узаемазвязаныя сродкі музычнай выразнасці. Асаблівасці дзялення галасоў у спеўным гурце і кампаненты (элементы) фактуры народнай песні. Функцыянальны падзел галасоў у народным ансамблі: мелодыя, басуючыя галасы, падгалосак (падводка), гармонія. Фактура як стылявая прыкмета песні. Асноўныя прынцыпы фактурнай арганізацыі традыцыйных песень. Тыпы народна-песеннай фактуры: меладычная (манадыйная і паліфанічная), унісонна-гетэрафонныя спевы, бурдонныя формы шматгалосся, шматгалосыя спевы з падводкай, гамафонна-гарманічная фактура. Несінхронныя формы шматгалосся (антыфоннае выкананне песень, шматгалоссе беларускай «бараны»). Віды народна-песеннай фактуры: полірытмія, поліметрыя. Характарыстыка элементаў фактуры. Мелодыя як галоўны элемент фактуры народнай песні. Прыёмы выкладання мелодыі ў народнай песні: аднагалоссе, дыяфонія, падваенні. Падгалосак імітатыўны і кантрапунктуючы. Псіхалагічныя аспекты фарміравання народнага ансамбля.

### *Тэма 10. Жанрава-стылявыя асаблівасці беларускай народнай песні*

Жанры беларускай народнай песні. Жанравая дыферэнцыяцыя песень па функцыі, змесце і паэтыцы. Гендарныя і ўзроставыя характарыстыкі жанру. Стылявыя асаблівасці народнай песні. Стылявое дзяленне на галасавыя функцыі. Ладагарманічная структура песні ў святле яе стылявой прыналежнасці. Стылявая прыналежнасць музычных прыёмаў выканаўцаў. Стылявое дзяленне па гаворках. Форма выканання народнай песні (індывідуальная, калектыўная).

### *Тэма 11. Выканальніцкія манеры спеваў беларусаў*

Асэнсаванне спецыфікі выканальніцкіх традыцый у залежнасці ад спецыфікі функцыянавання народнай песні ў грамадстве. Сродкі музычнай выразнасці народнай песні ў адпаведнасці з формай і абставінамі яе выканання.

Моўная аснова выканальніцкіх традыцый. Рэгіянальная дыферэнцыяцыя народнай песні. Рэгіянальныя і мясцовыя моў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя дыялекты і манеры спеваў. Моўна-фанетычныя асаблівасці і спецыфіка гуку. Слоўнік моўных дыялектаў Беларусі.

Тэмбрава-рэгістравыя асаблівасці і спецыфіка мужчынскага і жаночага спеву. Грудная і галаўная манера спеваў. Мікст. «Парадаксальнае» фразіраванне як выканальніцкі прыём і характэрная стылявая прыкмета. Дыхальныя паўзы і нелагічная цэзура.

Выканальніцкі аспект у песенных жанрах розных гісторыка-стылявых пластоў беларускага фальклору. Абрадавая дэкламацыя, воклічы, гуканні; сінкрэтычная сувязь славеснага, інтанацыйна-рытмічнага, выяўленчага кампанентаў у працэсе выканання; рухомасць кампазіцыйных, метрарытмічных заканамернасцей, інтанацыйнага контуру, тэмбравай характарыстыкі.

Адмысловыя прыкметы формы галашэнняў – пачатковы вокліч, словаабрывы, цэзуры, дынаміка пеўчага дыхання, якая абумоўлівае працягласць частак формы.

Выканальніцкі стыль каляндарна-абрадавых песень: тэмбравая і рэгістравая афарбаванасць, абрадавая «інтэнсіўнасць» гучання, абрадавая значнасць і выразнасць доўгіх тонаў – «клічаў».

Характэрныя асаблівасці выканання. Значэнне пеўчага дыхання (гукавядзення) пры выкананні лірычных песень (унутрыскладовыя распевы, агогіка). Асаблівасці сродкаў музычнай выразнасці як адлюстраванне выканальніцкіх заканамернасцей у песнях, злучаных з рухам.

### *Тэма 12. Паэтыка беларускага песеннага фальклору*

Народна-песенная паэзія. Адрозненне паэзіі ад прозы. Верш як паэтычная адзінка. Народна-песенны верш. Чысты верш. Музычная строфіка. Вершаваны радок.

Родавыя і жанравыя асаблівасці паэтычнага тэксту. Роды і жанры ў народна-песенным вершы. Эпас. Эпічныя жанры. Лірыка. Лірычныя жанры. Ліра-эпічныя жанры ў фальклоры. Жанравае дзяленне народных песень.

Сюжэт і кампазіцыйная структура верша. Тыповы сюжэт. Асноўныя кампазіцыйныя прыёмы (апавяданне, апісанне, паступеннае звужэнне вобразаў і інш.).

Сродкі мастацкай выразнасці ў фальклоры. Алегорыя. Сімволіка народнай песні. Тропіка ў народна-песенным вершы: метафара, метанімія, сінекдаха, эпітэт, гіпербала, літота, іронія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рытмаскладовая формула верша. Азначэнне рытмаскладовай формулы верша. Прынцыпы і правілы, неабходныя для складання рытмаскладовай формулы верша.

Дыялектныя асаблівасці паэтычнага тэксту. Асаблівасці дыялекту ў народна-песенным вершы. Дзяленне мовы на прыслоўі і гаворкі. Гаворка і манера спеву выканаўцы. Дыялектныя словы. Дыялектныя формы слоў. Лексічныя і асноўныя фанетычныя асаблівасці мясцовага дыялекту.

## Раздзел III. Раннетрадыцыйны (архаічны) фальклор

### *Тэма 13. Каляндарна-песенная культура Беларусі*

Земляробчы каляндар як своеасаблівае адлюстраванне народнага светапогляду і аснова каляндарна-песеннай культуры Беларусі. Этымалогія жанраў. Язычніцтва і хрысціянская міфалогія ў песенных творах каляндарна-абрадавага цыкла. Аграрна-магічная аснова і пазнейшыя трансфармацыі. Агляд гадавога кола каляндарных свят і абрадаў. Абрады і песні зімовага перыяду. Абрады і песні веснавога перыяду. Абрады і песні летняга перыяду. Абрады і песні восеньскага перыяду. Карагоды і карагодныя песні. Жанры каляндарна-абрадавых песень. Карты тэрытарыяльнага распаўсюджання каляндарна-абрадавых песень. Стылістыка і тыпалогія напеваў каляндарна-абрадавых песень. Монавобразнасць структуры. Інтанацыйна-семантычная канцэнтраванасць, ёмістасць і маналітнасць эстэтычна-мастацкага вобраза. Абагуленасць і афарыстычная сціснутасць напеваў. Паняцці «тыповы напеў», «напеў-формула», «песенна-меладычны тып». Своеасаблівая ідэйна-вобразная арганізацыя раннетрадыцыйнага фальклору, моўныя асаблівасці, сюжэтныя структуры, паэтыка. Рытмічная арганізацыя паэтычных тэкстаў і напеваў. Рытмаінтанацыйны комплекс, ладава-меладычныя асаблівасці напеваў. Формы і традыцыі выканання, унісонна-гетэрафонныя спевы. Сюжэтна-тэматычныя групы, паэтыка каляндарна-абрадавых песень. Музычная стылістыка: тыпы напеваў і іх арэалы, гукарады і ладавыя структуры, меладычна-інтанацыйныя комплексы, тыпы інтанавання, рытмічная арганізацыя напеваў, страфічныя і нестрафічныя напевы, формы меластрафы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 14. Сямейна-абрадавы песенны цыкл*

Сямейныя святы і абрады як частка традыцыйнай культуры беларусаў, іх сувязь з сацыяльнай структурай грамадства. Жанры песень сямейна-абрадавага цыкла. Радзіны ў сістэме сямейнай абраднасці. Беларускія радзінныя песні – унікальная з’ява ў песенным фальклоры славянскіх народаў. Тыпалогія напеваў радзінных песень. Беларускае вяселле як адлюстраванне эвалюцыі сямейна-шлюбных адносін. Сутнасць і значэнне вясельных рытуалаў. Функцыянальная прыналежнасць вясельных песень. Песні імператыўныя, апавядальныя, дакаральныя, велічальныя, жартоўныя, вясельныя галашэнні, песні да скокаў. Тыпы напеваў і зоны іх распаўсюджання. Музычная драматургія вясельнага абраду. Традыцыя пахавальных аплакванняў. Функцыянальнае прызначэнне пахавальных галашэнняў. Асаблівасці паэтыкі. Стылістыка выканання.

### *Тэма 15. Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах іх выканання*

Пазаабрадавы фальклор апавядальнай і лірычнай традыцыі. Жанрава-тэматычныя групы: лесавыя, лугавыя, палявыя, за таварам, за кудзеляй, на супрадках, запусныя, пятроўскія, зімовыя, карагодныя, бяседныя. Песні ў пост і духоўныя вершы. Рэлігійная аснова зместу песень, іх павучальны, маральна-дыдактычны характар. Тэматыка. Беларускія балады як від народнага ліра-эпічнага мастацтва. Адлюстраванне ў баладных песнях драматычна-трагічных калізій у індывідуальным, сямейным і грамадскім жыцці. Маральна-дыдактычны характар балад. Формы выканання. Умоўная прымеркаванасць. Сюжэтныя і ўнутрыжанравыя групы песень. Балады міфалагічныя, казачныя і легендарныя, гістарычныя, балады-загадкі, балады карагодна-гульнявога складу, навелістычныя балады. Ранняя песенная лірыка.

### *Тэма 16. Карагодна-гульнявая традыцыя беларусаў*

Этымалогія і аб’ём зместу тэрмінаў «карагод», «танок». Вызначэнне жанру. Харэаграфія – неад’емны кампанент структуры сінтэтычнага карагоднага тэксту.

Класіфікацыя карагодаў: па структурных і стылявых асаблівасцях – карагоды-песні, карагоды-гульні, карагоды-танцы; па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формах руху – карагоды шэсця, кругавыя карагоды, лінейныя (сценка на сценку) карагоды, арнаментальныя карагоды.

Тэрмін «вадзіць карагоды». Абрадавая семантыка харэаграфічных малюнкаў у карагодах. Карагод як своеасаблівая форма магічнай практыкі селяніна-земляроба.

Сезонная прымеркаванасць карагодаў. Прымеркаваныя і непрымеркаваныя карагоды.

Сюжэтна-кампазіцыйная аснова (драматургія) карагодна-гульнявых песень. Сістэма выразных сродкаў карагодна-гульнявых песень. Рысы стылю карагодных і гульнявых песень: рытмічныя і меладычныя структуры; наяўнасць развітых рэфрэнаў (семантычных і асемантычных); прынцыпы пашырэння і сціску. Тэматыка і паэтыка карагодна-гульнявых песень. Жанравыя групы карагодных песень: своеасаблівасць стылістыкі і тыпалагічна ўстойлівыя прыкметы.

Зоны распаўсюджання карагодна-гульнявой традыцыі на тэрыторыі Беларусі і рэгіянальныя асаблівасці карагодна-гульнявой традыцыі беларусаў.

## Раздзел IV. Пазаабрадавая сялянская лірыка (класічны фальклор)

### *Тэма 17. Стылістычныя рысы і асаблівасці пазаабрадавага песеннага фальклору*

Пазаабрадавая лірыка. Класіфікацыя песеннай лірыкі па эстэтычна-мастацкай і сацыяльнай функцыях. Вобразная сістэма. Псіхалагічны паралелізм. Метафара. Эпітэт. Сімволіка гора і шчасця. Прынцып паўтаральнасці як аснова паэтычнага сінтаксісу песеннай лірыкі. Музычна-меладычныя паўторы: анафара, прыпеў як тып паўтору, захоп-паўтор, падхват. Сэнсавыя паўторы: антыфонны паўтор, паўтор у форме пытанняадказу. Характэрныя музычна-стылявыя асаблівасці. Музычнарытмічныя формы лірычных песень. Індывідуалізацыя напеваў і меладычнае развіццё як аснова кампазіцыйнай пабудовы пазаабрадавай лірычнай песні. Формы вершаскладання. Ладавая і рытмічная арганізацыя напеваў лірычных песень. Фактура пазаабрадавых лірычных песень. Шматгалосыя спевы з падводкай як форма лінеарнага мыслення. Гендарны аспект выканальніцкай эстэтыкі лірычных песень. Спецыфічныя асаблівасці паэтыкі пазаабрадавых песень. Узаемасувязь пазаабра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давага фальклору і абрадавай песні як своеасаблівая рыса беларускай народна-песеннай традыцыі.

### *Тэма 18. Жанравая сістэма пазаабрадавай лірычнай песні*

«Абрадавая» і «неабрадавая» лірыка. «Мужчынская» і «жаночая» лірыка. «Павольныя» і «хуткія» песні.

Жанравая прыналежнасць песень. Сюжэтна-тэматычныя групы.

Песні сацыяльна-бытавыя (казацкія, рэкруцкія, салдацкія, чумацкія, батрацкія, бурлацкія). Песні сямейна-бытавыя. Песні пра каханне. Жартоўныя песні і песні да скокаў. Вызначэнне жанравай спецыфікі лірычных песень.

## Раздзел V. Нетрадыцыйны фальклор

### *Тэма 19. Кантавая культура Беларусі*

Генезіс і распаўсюджанне кантавай культуры ў Беларусі. Грамадска-палітычныя і гісторыка-культурныя аспекты ўзнікнення і распаўсюджання кантаў на тэрыторыі Беларусі. Рэфармацыя і новы стыль. Узаемаўплывы традыцыйнага і прафесійнага мастацтваў. Паэтыка, ладава-меладычны і музычна-рытмічны склад (музычны інструментарый і акордава-гарманічнае мысленне, вершаскладанне новага тыпу). Беларускія канцыяналы. Сюжэтна-тэматычныя групы беларускіх кантаў. Сучасная традыцыя кантавага выканання ў Беларусі.

### *Тэма 20. Прыпеўкі як від народнай песенна-музычнай мініяцюры*

